информации музыкальным руководителям дошкольных учреждений и облегчить процесс адаптации молодых специалистов.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Байрон, А. Drupal: создание и управление сайтом / А. Байрон [и др.]. – Пер с англ. - СПб : Символ-Плюс, 2012. – 576 с.

2. Грачев, А. Г. 21 Создаем свій сайт на WordPress: быстро, легко и бесплатно Работа с CMS WordPress 3.— СПб.: Питер, 2011. — 288 с.: ил.

3. Норт, Б. Joomla! 1.5. Практическое руководство, 2-е издание / Б. Норт. – Пер. с англ. – СПб : Символ-плюс, 2010. – 464 с.

4. Учебная программа дошкольного образования для учреждений дошкольного образования с русским языком обучения и воспитания: Постановление Министерства образования Республики Беларусь от 15.08.2019 № 138 – Минск : Дикта, 2019. – 479 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Булатовская Н. И., студент 419б группы

Научный руководитель – Концевич И. В., преподаватель

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ АБРАДУ КУПАЛЛЕ НА ПАДЗВІННІ

Надыход лета, яго кульмінацыя ў беларускім народным каляндарна-абрадавым фальклоры звязаны з адным з самых старажытных свят – Купалле – свята летняга сонцавароту, якое адзначаецца ў ноч з 23 на 24 чэрвеня па ст.ст. (з 6 на 7 ліпеня па н.ст.). Назва “Купала” мае некалькі трактовак, самая старажытная з якіх “купа” – “купець”, што азначае “гарэць”, але ёсць і іншыя “куп, кып” – “ярыцца”, “злавацца”, “ускіпаць”; “куп” – збор, зборышча людзей; “бапцістос” – “купель”, “хрысціць”.

На Падзвінні свята летняга сонцавароту мае назвы: “Купалле”, “Купала”, “Іван”, “Ян”, “Цвятны Іван”. Гэта свята карысталася велізарнай

папулярнасцю ў народзе. Яно дайшло з глыбокай старажытнасці і ўвасабляла яднанне чалавека з прыродай. Свята Купалле ўключае ў сабе вялікую разнастайнасць абрадаў, якія суправаджаюць яго, а таксама песні, танцы, карагоды.

Своеасаблівай і вельмі цікавай часткай абраду Купалля на Падзвінні была традыцыя збору і асвячэння зёлак на Іаана Хрысціцеля, якая вельмі распаўсюджана па ўсяму Падзвінню. Па народнаму павер'ю, зёлкі валодаюць сваімі незвычайнымі лекавымі якасцямі менавіта на Іванаў дзень. Іх збіраюць жанчыны напярэдадні свята або ў дзень свята раніцай да ўсходу сонца і нясуць асвячаць у царкву. “На Яна пасьвяцалі ўсякія цьвяты: і гароднія, і палявыя, і быльнік і дажа ветачку, і палынь. Крапіву не сьвеньцюць і дзядоўнік” – распавядала Марыя Лабаноўская, 1923 г.н., в. Новы Пагост, Міёрскі раён [2; 149 с.]. “Перад Янам у цвяты бывала ходзюць, песні пяюць там, цвяты рвуць, а тады ў цэрькву вязуць свяціць на Яна” – расказвала Анастасія Грыбоўская, 1917 г. н., в. Лыска, Гарадоцкі раён [Там жа]. Збор зёлак суправаджаўся песнямі (запісана ў 1972 г. у в. Валынцы Верхнядзвінскага р. ад Вольгі Яфімаўны Сівохі, 63 г. [1, с. 145, № 70]):




Малюнак 1 – нотны прыклад

Пасля збору і асвячэння зёлак, да заходу сонца перад Купальскай ноччу, або раніцай да ўсходу на Яна, дзяўчаты плялі вянкі з розных траў і кветак: з “васілак” (валошкаў), “Івана да Мар’і” і іншых. З імі яны варажылі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўвалі іх як ахоўны сродак ад ведзьм і чараўнікоў. Ахоўчыя вянкі гаспадыні вешалі па сценах у хаце і ў хлеве, да пачатку наступнага Купалля.

Абрад завівання вянкоў меў не толькі ахоўчы сэнс, але і любоўны. На Купалле кожная дзяўчына завівала вянок на сябе і на хлопцаў – магчымых жаніхоў на яе руку і сэрца. Даходзіла да дваццаці чатырох вянкоў. У весцы Сталіца Шаркаўшчынскага раёна дзяўчаты ўпрыгожвалі лодкі вянкамі, каталіся на гэтых лодках, пелі песні, варажылі на вянкі.“На Купала маладзёж ходзюць, вяночкі дзяўчаты плятуць. Ходзюць, піяюць у вянках, а патом, як ужо ісьці спаць, сьнімаюць усё з сябе, толькі ў рубашкі астаюцца, вянок на галаву адзяваюць свій і другі – на якога парня загадваюць – два вянкі адзенуць на галаву і ідуць к пруду, ні сь кем ні разгаварвая. І пускаюць эты вянкі на ваду, а на заўтра ідуць сматрэць: сплыўшыся эты вянкі ці не. Есьлі не сплыўшыся – нічога ня будзець, ня будзе эты парень зь ёю” – са слоў Сцепаніды Бубала, 1913 г.н., в.Каралёва, Верхнядзвінскага раёна [2, с. 151].

Акрамя "варожбаў на вадзе" існавалі “варожбы на сон” у вёсцы Гарбачэва Расонскага раёна і ў весцы Мураўшчына Полацкага раёна. Дзяўчаты збіралі дванаццаць розных траў і клалі пад падушку з прыгаворам: “Сужаны-ражаны, прыхадзі вянок плясьці”. “Як лажысься спаць, пад галаву ложыш цьвяты: белы, жоўты, красны і сіні. А потым гэты цьвяты цягнулі. Які выцягнеш цьвет, за такога замуж зайдзеш: сіні – за старога, белы – саўсём малады, красны – у паравы, а жоўты – хворы будзець жаніх” – распавядала Валянціна Сідаровіч, 1923 г.н., з в. Кураполле, Пастаўскі раён [2, с. 151].

Купалле, як і перыяды Каляд, Масленіцы, – час карнавальнай свядомасці, калі дазваляецца катэгарычна недазволенае ў іншы час. Адным з праяўленняў купальскай карнавальнай ”уседазволенасці” былі рытуальныя бясчынствы моладзі: абмажаванне дзёгцем варот, вешанне каму-небудзь курыцы, здыманне варот і інш. Такім чынам, маладзёжны калектыў наказваў ўсіх жыхароў вёскі, якія найбольш правініліся перад астатнімі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падрыхтоўка да Купальскай ночы заўсёды пачыналася з разпальвання вогнішча. На Падзвінні для купальскіх агней выбіралі месцы на ўзвышшах, у лесе, каля вадаёмаў, на берагах рэк, каля жыта, рэдка на скрыжаваннях дарог. На кастрах спальвалі ўсялякі стары хлам, сухія дрэвы і галінкі траецкага “мая”. Вогнішча разводзілі пасля захаду сонца, і менавіта вакол агню канцэнтраваліся ўсе абрадавыя і гульнёвыя падзеі купальскай ночы. Пасля распальвання агню ладзілася агульная вячэра, дзе спявалі, танцавалі, гулялі і гралі на музычных інструментах. Пасля вячэры спявалі купальскія песні, вадзілі карагоды і ладзілі гульні (запісана ў 1972 г. в.Забор’е Расонскага р. ад Еўдакеі Цімафееўны Шубанавай, 71 г. [1, с. 129, № 59]):




Малюнак 2 – нотны прыклад

У многіх месцах Падзвіння выразна выяўляюцца элементы маскараду, дзе спецыяльна пераапраналіся ў ведзьму, русалак, нявесту, бабу ягу, для вяселля, забаў, танцаў, гульняў і жарту.

Легенды і міфы аб чарадзейнай папараць-кветцы, якая расцвітае раз у год у купальскую ноч кажа, хто падсцеражэ і схопіць яе мігатлівы агенчык, той стане празорлівы і будзе разумець гаворку дрэў, траў і звяроў. Аднак адшукаць папараць-кветку можа толькі адважны і сумленны чалавек. “У дванаццаць часоў ночы ідуць у лес і шукаюць эту папараць, яна цвіце ў дванаццаць часоў. Як знойдзеш, дак вельмі вялікае шчасце табе. Но там так страшна, чэрці крычаць… Редка хто адчаіваўся ісці за этым цветам. Кажуць яна галубым цветам цвіцець. Як найдзеш, то дужа багатым будзеш” – са слоў Ірыны Шчымялёвай, 1928 г.н., в. Арловічы, Дубровенскага раёна [2, с. 154].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У некаторых месцах Падзвіння ў купальскую ноч і дзяўчаты, і хлопцы купаліся ў вадаёмах або ўмываліся ў жытняй расе. Рабілі гэта абавязкова да ўсхода сонца: "Хто ў расе пакупаўся, той і маладзец. Лічыцца, што гэта харашо" – расказвала Ганна Бандарэнка, 1916 г.н., в. Кармалысы, Полацкі раён [2, с. 155].

Адзін з заключных момантаў-рытуалаў у структуры купальскай абраднасці – калектыўнае вітанне ўзыходзячага сонца, цікаванне за яго "ігрой" удзельнікаў Купалля. Паказальна, што якраз, гэты таямнічна – урачысты момант выкарыстоўваўся ўдзельнікамі Купалля для заклінання цёплага, спагаднага лета, добрага ўраджаю. У народзе лічылася, што сонца на ўзыходзе "грае" два разы ў год – на Вялікдзень і на Яна. "Калі хто ішоў на Купалле сонца пільнаваць, дак ішлі з вечара і да ўтра, а хто і пазаснуць кала агня. А тады ідзем глядзець, як сонца іграе – ўсякіе кругі: і сіняе, і жоўтае, і краснае, і зялёнае, і так быстра, быстра круціцца, а як жа ж долга…"–распавядала Анастасія Лукашонак, 1923 г.н., з в. Канчаны, Верхнядзвінскага раёна [2, с. 155].

Асноўны змест абраду "Купалле" на Падзвінні, паказвае нам, што свята "Івана Купала" вельмі распаўсюджана на Віцебшчыне і мае свае асаблівасці святкавання. Традыцыйнае Купалле – надзвычай складаная па сваёй структуры сістэма абрадаў, рэшткі якой захаваліся да нашага часу ў нязменнасці. Беручы свае вытокі ў глыбіні тысячагоддзяў, яно разам з тым з'яўляецца часткай сучаснай народнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ВЫКАРЫСТАННЫХ КРЫНІЦ

1. Мажэйка, З.Я. Песні беларуская Паазер'я / З.Я. Мажэйка – Мн.: Навука і тэхніка, 1981. – 494 с.

2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; Складальнік Т. Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 910 с.